**Назараў Васіль Іванавіч**



Кандыдат матэматычных навук, дацэнт (1988). Нарадзіўся 02.07.1955 г. у в. Крываносы, закончыў школу ў 1972 годзе. Пасля заканчэння ў 1977 г. механіка-матэматычнага факультэта БДУ імя У.І. Леніна працаваў інжынерам у Беларускім палітэхнічным інстытуце, асістэнтам кафедры вышэйшай матэматыкі Мінскага радыётэхнічнага інстытута. У 1981 г. паступіў у аспірантуру на кафедру функцыянальнага аналізу БДУ, якую паспяхова закончыў і абараніў кандыдацкую дысертацыю. З 1988 г. – дацэнт кафедры матэматычных метадаў тэорыі кіравання БДУ. Надрукаваў больш за 50 навуковых артыкулаў. Памёр 26.06.1993 года.

З успамінаў класнага кіраўніка Серай Маіны Канстанцінаўны: “Вася быў сакратаром камсамольскай арганізацыі школы. Па характары вельмі ўпарты, сур’ёзны, просты і вельмі разумны. Меў здольнасці да дакладных навук, таму пастаянна ўдзельнічаў у алімпіядах, займаў прызавыя месцы. Заўсёды дапамагаў бацькам, шчыра паважаў іх. Хадзіў у грыбы, ягады. Так зарабляў грошы. Бацька яго ў кажуху ездзіў да сына на абарону дысертацыі. Вася не пакідаў бацькоў і тады, калі ўжо дасягнуў пэўных вышынь у навуцы. Прыязджаў часта і займаўся сялянскай працай. Пры сустрэчы заўсёды шчыра вітаўся, гаварыў, пытаўся пра здароўе, цікавіўся школьнымі справамі. Да канца заставаўся разумным і простым.”

З успамінаў Камаровай Галіна Іванаўна, роднай сястры Васіля Іванавіча Назарава: “Наша сям’я была мнагадзетная. Мы з Васем былі апошнія. Ён старэйшы за мяне. З самага ранняга дзяцінства многа працавалі. Дапамагаць бацькам – гэта святы абавязак. Аднойчы пасля ўрачыстай лінейкі мы з Васем вярнуліся дадому, а бацькоў няма. Яны ў гэты час грэблі салому. Мы пераапрануліся і пайшлі ім дапамагаць. Гэта

работа вельмі пыльная (а перад школай мы хадзілі ў лазню), але не дапамагчы бацькам  не маглі. У летне-асенні перыяд хадзілі ў ягады, грыбы, здавалі, каб зарабіць грошай на школьныя прыналежнасці і форму. Так жылі ўсе сельскія дзеці. Вася і потым не забываў сваіх бацькоў”.